ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 2 (970) | ПЯТНІЦА, 3-га студзеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.



НА ПЕРАДАВЫЯ ПОЗЫЦЫІ КУЛЬТУРНАГА ФРОНТУ

За час свайго існаваньня БССР, пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі ў соцыялістычным і нацыянальна-культурным будаўніцтве дасягнула вялікіх посьпехаў. Пераможнае соцыялістычнае наступленьне па ўсіх франтох на капіталістычныя элемэнты праходзіць ва ўмовах жорстка-абвостранай клясавай барацьбы, у тым ліку і на ідэолёгічным фронце.

Аднак, удзелам ЛКСМБ у нацыянальна-культурным будаўніцтве хваліцца няма чым. На шэраг вылазак клясава варожых нам элемэнтаў замест таго, каб даваць ім рашучы адпор, мы зачастую заставаліся ў баку ад гэтай барацьбы, як напрыклад, у час асабліва абвостранай барацьбы з нацыянал-дэмократызмам, тэатральнай дыскусіі і г. д.

Абвешчаны ЦК ЛКСМБ трохмесячнік беларускай пролетарскай культуры і пролеткультуры нацменшасьцяй, павінен яшчэ больш мобілізаваць комсамол на барацьбу з клясава-варожай ідэолёгіяй, контрэволюцыйнымі вылазкамі на ідэолёгічным фронце і падагнаць комсамол шчыльна да практычнага ўдзелу ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.

Трохмесячнік павінен павысіць удзел ЛКСМБ у агульным соцыялістычным будаўніцтве, асабліва у адной з неадлучных частак яго—культурным будаўніцтве. Кожны комсамолец павінен вывучаць, ведаць і практычна ажыцьцяўляць пяцігодку культурнага і гаспадарчага будаўніцтва БССР. Комсамол павінен стаць баявой арміяй—ударнай брыгадай у яе выхаваньні. На конкрэтных прыкладах соцбудаўніцтва выхоўваць масы комсамольцаў і беспартыйнай моладзі ў духу ленінскай лініі партыі. Мы павінны яшчэ больш энэргічна, больш упарта змагацца за генэральную лінію партыі, даючы рашучы адпор правым правага ўхілу і прымірэнцтва да яго, не саслабляючы барацьбы з „левым“ фразёрствам.

Абвострацасьць клясавай барацьбы асабліва у сучасны момант выклікала актывізацыю беларускага нацыянал-дэмократызму, ідэолёгія лкога змыкаецца з контр-рэволюцыйнай ідэолёгіяй соцыял-фашызму. Комсамол павінен з усёй рашучасьцю выпраўляць, меўшае месца прарывы ў барацьбе з нацыянал-дэмократызмам, даючы яму рашучы адпор, як прадстаўляючую самую галоўную небясьпеку на даным этапе разьвіцьця. Неабходна ва ўсіх ячэйках ЛКСМБ прапрацаваць пытаньне, у чым соцыяльныя карэньні беларускага нацыянал-дэмократызму. Ні на хвіліну не саслабляць барацьбы з праявамі рознага роду шовінізмаў (расійскі, яўрэйскі, польскі і г. д.) і антысэмітызмам, рашуча выкрываючы іх контр-рэволюцыйную сутнасьць. Усямерна разгортваць і паляпшаць інтэрнацыянальнае выхаваньне ў ЛКСМБ і сярод рабоча-батрацкай і працоўнай моладзі, як адно з важнейшых сродкаў выхаваньня мас у духу лініі партыі.

У час трохмесячніка комсамол павінен паставіць ва ўсю шырыню пытаньне аб падрыхтоўцы пролетарскіх кадраў на ўсе франты соцыялістычнага будаўніцтва і асабліва на нацыянальна-культурны фронт, што ва ўмовах Беларусі набывае выключна важнае значэньне.

У пытаньнях правядзеньня нацыянальнай політыкі партыі, асабліва ў частцы правядзеньня беларусізацыі, мы маем з боку часткі таварышоў недаацэнку політычнага значэньня беларусізацыі і гэта асабліва характэрна, для некаторых вытворчых ячэек комсамолу. Беларусізацыя асабліва ў вытворчых ячэйках знаходзіцца на пункце замярзаньня. Патрэбна паставіць ва ўсёй шырыні пытаньне, аб правядзеньні беларусізацыі ў практычнай рабоце. Трэба каб увесь комсамол Беларусі аўладаў беларускай мовай. Беларусізацыя зьяўляецца магутным сродкам партыі ў барацьбе з беларускім нацыянал-дэмократызмам, мы павінны паставіць ва ўсю шырыню пытаньне аб тым, каб комсамольская організацыя поўнасьцю ажыцьцявіла лінію партыі па пытаньнях беларусізацыі. Патрэбна рашуча даваць па руках тым, хто недаацэньвае гэтага пытаньня, хто імкнецца змазаць яго політычную сутнасьць.

Комсамол павінен узмацніць барацьбу з праявамі клясава-варожай ідэолёгіі у мастацтве, літаратуры, музыцы і г. д., змагаючыся за падпарадкаваньне мастацтва задачам соцыялістычнага будаўніцтва. Комсамол павінен аўладаць высотамі мастацтва. Мы павінны ў час трохмесячніка шырока разгарнуць маючыйся ў нас вопыт калектыўнага наведваньня кіно, тэатру, наладжваньне дыспутаў на розныя тэмы і г. д.

Трохмесячнік апраўдае сябе толькі тады, калі ў ім будуць удзельнічаць усе комсамольцы, рабоча-працоўная моладзь і савецкая грамадзкасьць. Мы заклікаем профсаюзы, навукова-культурныя ўстановы прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні трохмесячніку беларускай пролетарскай культуры і культуры нацменшасьцяў. Унутры комсамолу мы павінны шырока разгарнуць мэтады соцыялістычнага спаборніцтва па правядзеньню трохмесячніка. Прасякнуць усю работу шырокай крытыкай і самакрытыкай, разгарнуць унутры ячэяк шырокі ініцыятыўны рух па выкананьні пастаўленых задач, ствараючы ўдарныя брыгады, ініцыятыўныя групы з комсамольцаў і беспартыйнай моладзі па выкананьні конкрэтных галін работы.

Комсамол у час трохмесячніку павінен залажыць моцны падмурак свайго далейшага ўдзелу ў нацыянальна-культурным будаўніцтве.

Трохмесячнік павінен стаць не кампаніяй, разьлічанай на кароткія тэрміны, ён павінен стаць у асяродку ўвагі комсамольскай організацыі ў час яе штодзённай упартай работы на нацыянальна-культурным фронце.

М. Палякоў.

У ПАХОД



ЗА ПОЎНАЕ АЎЛАДАНЬНЕ ПРОЛЕТАРСКАЙ КУЛЬТУРАЙ

УДАРНЫЯ ЗАДАЧЫ

Трохмесячнік беларускай і нацменаў пралетарскай культуры распачаты комсамолам, набывае ў сёняшніх умовах вялізарнейшае значэньне. Культурны сэктар—адзін з важнейшых вучасткаў нашага соцыялістычнага будаўніцтва, бо індустрыялізацыя краіны, соцыялістычная рэконструкцыя сельскай гаспадаркі патрабуюць кадраў культурных людзей, кадраў тэхнічна ўзброеных, патрабуюць, каб удзельнікі соцыялістычнай рэконструкцыі рабочыя і бядняцка-серадняцкія масы сялянства былі пагалоўна пісьменнымі.

І тут на гэтых двух вучастках, з кадрамі і пісьменнасьцю, мы значна адстаем ад тэмпаў нашага соцыялістычнага будаўніцтва. Вось чаму на гэтыя два вучасткі ў час трохмесячніка павінна быць зьвернута першачарговая ўвага. Фронт няпісьменнасьці і пытаньне кадраў—нашы ўдарныя пытаньні і вырашэньне іх павінна ісьці парадкам ударным, шырока разгорнутым мэтадам соцспаборніцтва.

Вядучая роля ў культурным будаўніцтве, як і ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве, была і застаецца за пролетарыятам. Вось чаму распачаты трохмесячнік ставіць задачу аўладаньня пролетарыятам беларускай культурай, бо ад гэтага залежыць пралетарскі зьмест культуры, бо аўладаньне беларускай пролетарскай культурай, аўладаньне пралетарыямі гораду беларускай мовай, яшчэ больш узмацняе сувязь пралетарыяту з асноўнымі масамі сялянства. Адначасова ня меншая ўвага павінна быць аддадзена і культуры нацыянальных меншасьцяў, бо гэта забясьпечыць раўнамерны ўдзел усіх нацыянальнасьцяў БССР у соцыялістычным будаўніцтве краіны.

За час трохмесячніка ўвага савецкай грамадзкасьці павінна быць сконцэнтравана на органах народнае асьветы. З апаратных устаноў органы народнай асьветы павінны стаць сапраўднымі штабамі культурнай рэвалюцыі. Такімі яны стануць у той час, калі рабочыя організацыі возьмуць шэфства над органамі асьветы, калі мы ў работу гэтых органаў уцягнем прадстаўнікоў заводаў і нізавых мас настаўніцтва, калі мы ўзмацнім органы народнай асьветы лепшымі культурнымі сіламі.

Ініцыятарам трохмесячніку беларускай пролетарскай культуры і культуры нацыянальных меншасьцяў—зьяўляецца Ленінскі Комсамол Беларусі, але гэта ня значыць, што ўся работа па правядзеньню вялікага культурнага паходу павінна быць узложана на плечы комсамолу. З самага пачатку ў трохмесячнік павінна быць уцягнута ўся савецкая грамадзкасьць, усе культурныя сілы. Органы асьветы, профсаюзы, коопэрацыя разам з комсамолам, пад кірэўніцтвам партыйных організацый праводзяць найвялікшую справу пралетарыяту—падцягваньне культурнага сэктару да тэмпаў усяго соцыялістычнага будаўніцтва.

Трохмесячнік павінен быць цесна ўвязан, павінен дапамагаць нашай чарговай баявой задачы—вясеньняй пасеўнай кампаніі, павінен дапамагаць выкананьню баявой дырэктывы ЦК УсеКП(б).

А. СЯНЬКЕВІЧ.

КОМСАМОЛ! ПРАЦОЎНАЯ МОЛАДЗЬ!

СТАЛЕВЫМІ ШЭРАГАМІ, З ЛЕНІНСКАЙ ЗБРОЯЙ СЬМЕЛА Ў БОЙКУ

ЗА пролетарскую культуру СУПРОЦЬ варожай ідэолёгіі, коснасьці, старых традыцый і звычаяў

Краіну, прыгнечаную ў мінулым капіталам, краіну векавога ўціску нацыянальных меншасьцяў,ператворым пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі ў краіну разьвітай тэхнікі, у краіну з высокай пролетарской культурай усіх нацыянальнасьцяў.

У атаку па ажыцьцяўленьню дырэктыў партыі у культурным будаўніцтве

Да гэтага часу справаю культурнага будаўніцтва, на вялікі жаль, вельмі слаба цікавілася шырокая савецкая грамадзкасьць. Да гэтага часу яшчэ дзе-ні дзе маюцца гутаркі, што культурнае будаўніцтва зьяўляецца 3-м фронтам. У адпаведнасьці з гэтым дзе-нідзе глядзяць на справу культурнага будаўніцтва, як на трэцярадную справу, ня ўлічваючы таго, што **бяз культурнага ўдзелу працоўных немагчыма пасьпяховае соцыялістычнае будаўніцтва.**

Да гэтага часу воргаиы Нар. Асьветы не агорнуты працоўнай зацікаўленасьцю. Шырокія працоўныя масы не ўзялі непасрэдна пад свой кантроль справу культурнага будаўніцтва, таму і воргаиы Народнай Асьветы не зьяўляюцца сапраўднымі **штабамі** культурнае рэвалюцыі.

3-х месячны паход комсамолу Беларусі за пролетарскую культуру зьяўляецца першым **масавым уцягненьнем працоўных мас у справу народнае асьветы** і наогул ў справу культурнага будаўніцтва.

Што нам патрэбна ў першую чаргу:

1. У найхутчэйшы тэрмін зьліквідаваць няпісьменнасьць, без чаго ня зможа ісьці гутарка аб культурным уздыме працоўных мас. Нам трэба паставіць пытаньне і абавязкова зьдзейсьніць правядзеньне ліквідацыі няпісьменнасьці не праз 5 год, як намячалася па 5-гадоваму пляну, **а праз 3 гады.**

Тыя тэмпы і тая шырокая зацікаўленасьць савецкае грамадзкасьці, якая разгарнулася ў апошнія часы, сьведчаць аб тым, што няпісьменнасьць у 3 гады зьліквідуем.

2. Забясьпечыць сацыялістычнае будаўніцтва патрэбнымі нам кадрамі—кіраўнікоў і спэцыялістых. ЦК КП(б)Б пастанавіў, каб у гэтым годзе накіраваць у ВНУ і Тэхнікумы БССР ня менш 1000 чал. комсамольцаў. Перад комсамолам і органамі Нар. Асьветы стаіць адказнейшая задача падрыхтаваць іх да паступленьня ў ВНУ і Тэхнікумы праз розныя курсы.

Гэтую справу трэба пачаць **і замацаваць** у час культпаходу.

3. Яшчэ больш узмацніць барацьбу за **пролетарска - клясавы зьмест** у рабоце нашых культасьветных установ, бо да гэтага часу мы яшчэ назіраем скрыўленьне клясавай лініі, асабліва ў выхаваўчай рабоце школы.

У зьвязку з абвастрыўшайся клясавай б а р а ц ь б о й мы назіраем адбіткі клясавай барацьбы ў школе, якая часта пераплятаецца з нац. момантамі. Таму перад намі стаіць востра пытаньне, належнае пастаноўкі выхаваўчае працы, **асабліва па інтэрнацыянальнаму і антырэлігійнаму** выхаваньню.

Да гэтага часу яшчэ досыць востра стаіць пытаньне належнага правядзеньня ў культасьветных установах **беларусізацыі**, разам з забясьпечваньнем абслугоўваньня нац. меншасьцяў. Можна як прыклад, спаслацца на Бабруйскія гарадзкія школы, дзе амаль ва ўсіх школах выкладаньне грамадазнаўства праводзіцца на расейскай мове. Другі прыклад—гэта наш музтэхнікум, які досыць шырока абслугоўвае канцэртнымі сіламі профсаюзныя клюбы і амаль увесь рэпэртуар ідзе на расійскай мове. Мне асабіста некалькі разоў ужо, некаторыя таварышы задавалі пытаньні, на якой мове вядзецца навучаньне ў музтэхнікуме.

Карыстаючыся выпадкам, трэба некалькі слоў сказаць аб надворным афармленьні выступленьня нашых мастацкіх сіл: нашы мастацкія сілы, асабліва тэатральныя, чамусьці лічаць, што працоўныя Беларусі ходзяць выключна ў лапцях, альбо—шэдэўрам беларускае песьні зьяўляецца старая трухлявая нудзьга, не гаворачы ўжо аб тым, што ўсім, што называецца, навязла ў зубох „знаменитая“ лявоніха. Між тым, маецца шмат прыгожых, бадзёрых новых сьпеваў, скокаў, якія адбіваюць сучаснасьць, якія могуць не наганяць нуду, а заклікаць да актыўнага творчага жыцьця.

Рэканструкцыйны пэрыяд, узмацненыя тэмы соцыялістычнага будаўніцтва патрабуюць ад нас прыстасаваньня ўсяе працы да забатрабаваньняў сучаснасьці. Трэба пераключыцца ў нашай працы на новыя рэйкі, узмацніць тэмпы нашай работы, каб мы не адставалі ад агульных тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва і гэтым самым не былі-б „трэцім“ фронтам, а часткаю агульнага фронту соцыялістычнага будаўніцтва.

3-хмесячны паход комсамолу Беларусі за пролетарскую культуру павінен і на гэтым вучастку соцыялістычнага будаўніцтва **ўзварухнуць усе працоўныя масы да актыўнага ўдзелу ў культурным будаўніцтве.**

Я думаю і ўпэўнен, што ўсе культ. працаўнікі ня толькі будуць дапамагаць комсамолу ў правядзеньні паходу, а самым актыўным чынам уключацца ў комсамольскія бадзёрныя шэрагі па правядзеньню паходу, па ажыцьцяўленьню дырэктыў партыі—аб культурнай рэвалюцыі.

А. Платун.

МАСТАЦТВА НА СЛУЖБУ

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ БУДАЎНІЦТВУ

Сёньня пачынаецца абвешчаны ЦК ЛКСМБ трохмесячнік беларускай культуры і культуры нацменаўскай. Ленінскі комсамол Беларусі выводзіць сваю, амаль стотысячную армію на перадавыя пазыцыі барацьбы за культурную рэволюцыю, для барацьбы за культуру пролетарскую па зьместу і нацыянальную па форме, барацьбу за ідэолёгічную чыстату і набліжэньне да мас усіх галін нашай культуры. Гэта гістарычны паход. Ім мы моцна павінны стукнуць па ворагу—цемры і бяскультур'і. Ленінскі комсамол выконвае конкрэтна пастаўленыя перад ім Леніным яшчэ на 3-м зьезьдзе задачы.

Трохмесячнік ахапляе ўсе галіны нашага культурнага будаўніцтва, у тым ліку і мастацтва. Пра вялікае значэньне мастацтва ў справе пролетарскай рэволюцыі ўжо шмат пісалася. Пісалася і пра тое, што на фронце барацьбы з клясавым ворагам найчасьцей здараюцца прарывы яго, якраз на вучастку мастацтва. А таму першай і асноўнай задачай трохмесячніку зьяўляецца праверка ідэалёгічнай чыстаты па ўсіх галінах мастацтва, мобілізацыя ўвагі пролетарскай грамадзкасьці навакол тае клясавай барацьбы, што зараз адбіваецца ў ім.

Пролетарыят, як кляса пераможная ў нас, як кляса, якая будуе соцыялізм, мае права патрабаваць высокай якасьці мастацкай продукцыі. Трохмесячнік павінен прайсьці пад лёзунгам рашучай і бязьлітаснай барацьбы з халтурай, якой усялякае бяздарнае дробнабуржуазнае атрэп'е імкнецца карміць працоўныя масы. Паставіўшы такія задачы, комсамольская армія павінна дамагчыся максымальнага выкарыстаньня мастацтва для справы соцыялістычнага будаўніцтва, для справы культурнае рэволюцыі. А гэта можна будзе зрабіць толькі тады, калі ўсе галіны мастацтва (літаратура, тэатр, кіно, музыка, выяўленчае мастацтва) б у д у ц ь набліжаны да шырокіх колаў працоўных, к а л і ўсе г а л і н ы мастацтва будуць пастаўлены пад агонь пролетарскай крытыкі, калі будзе разарвана тая абмежаванасьць, адарванасьць ад мас, некаторым чынам, сьветабаязьнь, што маюць месца ў нашым мастацтве.

Мы павінны правесьці ўсю працу пад лёзунгамі: „ніводнага пустога крэсла ў тэатры, альбо кіно на паказе ідэолёгічна вытрыманым і мастацка-аформленым“, ніводнага гледача на паказе, альбо сэансе з варожай нам ідэолёгіяй, халтурна-афармленай! Ніводнай кніжкі пролетарскай мастацкай літаратуры на складах і ў магазынах. Ніводнага чытача для шкоднай, ня нашай кніжкі!“

Выхад комсамолу на перадавыя позіцыі культурнага фронту павінен стаць сыгналам для ўсіх мастацкіх установ, мастаком, да выхаду на гэты фронт для супольнай барацьбы.

Літаратурныя аб'яднаньні, тэатры, кіно, музычныя і мастацкія ўстановы, паасобныя мастакі, павінны зараз-жа праверыць у сябе, што імі зроблена, каб выйсьці на гэты фронт, каб дапамагчы ленінскаму комсамолу выканаць узятыя на сябе задачы, каб сапраўды без хістаньняў ды рашуча стаць у першыя шэрагі дапаможнікаў і барацьбітоў за культурную рэволюцыю, каб сапраўды будаваць мастацтва пролетарскае па зьместу, нацыянальнае па форме, таленавітае, зразумелае, сучаснае.

Ал. НЕКРАШЭВІЧ.

Пункт, якога... ня выканалі

Праводзячы соцыялістычнае спаборніцтва вучні бабруйскай профтэхшколы паставілі ў дагаворы пункт аб 100 проц. правядзеньні беларусізацыі, як на сходах, так і наогул у штодзённым жыцьці вучняў.

З таго часу ўжо, як гаворыцца, шмат вады ў мора ўцякло але., наш пункцік па соцспаборніцтву наконт беларусізацыі застаўся «гласом вопиющего в пустыне».

Прамова тав. Сталіна на усесаюзнай конфэрэнцыі аграрнікау-марксыстых

Працяг. Пачатак гл. у нумары ад 1 студзеня

сваім нядаўнім выступленьні ў друку („Год вялікага пералому“) я разьвіваў пэўныя аргумэнты перавагі буйнае гаспадаркі ў земляробстве перад дробнай гаспадаркай, маючы на ўвазе буйныя саўгасы. Ня трэба і даводзіць, што ўсе гэтыя аргумэнты адносяцца цалкам і поўнасьцю да колгасаў, як буйных гаспадарчых адзінак.

Я гавару ня толькі аб калгасах разьвітых, якія маюць машынна-трактарную базу, але і колгасах першапачатковых, якія прадстаўляюць, так сказаць, мануфактурны пэрыяд колгаснага будаўніцтва і якія апіраюцца на сялянскі інвэнтар. Я маю на ўвазе тыя першапачатковыя колгасы, якія цяпер ствараюцца ў раёнах суцэльнай колектывізацыі, якія апіраюцца на простае складаньне прылад вытворчасьці.

Узяць, напрыклад, калгасы ў раёне Хапра, былое Данское вобласьці. З выгляду гэтыя колгасы, як быццам-бы не адрозьніваюцца з пункту погляду тэхнікі, ад дробнае сялянскае гаспадаркі (мала машын, мала трактараў). А між тым, простае складаньне сялянскіх прылад у нетрах колгасаў дало такі эфэкт аб якім і ня марылі нашы практыкі. У чым выяўвіўся гэты эфэкт? У тым, што пераход на рэйкі колгасаў даў пашырэньне пасеўнае плошчы на 30-40 і 50 проц. Чым вытлумачыць гэты „головокружительный“ эфэкт? Тым, што сяляне, якія бясьсільны ва ўмовах індывідуальнае працы, абярнуліся ў надзвычайна вялізарную сілу, склаўшы свае прылады, аб'яднаўшыся ў колгасы.

Тым, што сяляне атрымалі магчымасьць апрацоўваць пакінутыя землі—цаліну, якія цяжка апрацоўваць ва ўмовах індывідуальнае працы. Тым, што селянін атрымаў магчымасьць узяць цаліну ў свае рукі. Тым, што атрымалася магчымасьць пусьціць у ход паасобныя кавалачкі, якія пуставалі, межы і інш. Пытаньне аб апрацоўцы закінутых зямель і цаліны мае вялізарнае значэньне для нашае сельскае гаспадаркі.

Вы ведаеце, што восьсю рэволюцыйнага руху ў Расеі ў стары час зьяўлялася аграрнае пытаньне. Вы ведаеце, што аграрны рух ставіў адной з сваіх мэт зьнішчыць малазямельле. Многія думалі тады, што гэтае малазямельле зьяўляецца абсалютным, г. зн., што няма больш годных зямель, здатных для апрацоўкі. А што-ж высьветлілася на справе?

Цяпер зразумела ўсім, што вольных зямель у СССР было дзесяткі мільёнаў гэктараў. Але апрацоўваць іх сваімі мізэрнымі прыладамі селянін ня меў ніякае магчымасьці. І іменна таму ён ня меў магчымасьці апрацоўваць цаліну і пакінутыя землі, іменна таму цягнуўся ён „да мяккіх зямель“, зямель якія належалі памешчыкам, зямель годных для апрацоўкі сіламі сялянскага інвэнтара ва умовах індывідуальнае працы. Вось у чым заключалася а с н о в а „малазямельля“.

Ня дзіва таму, што наш Зернатрэст мае цяпер магчымасьць пусьціць у ход 20 мільёнаў гэкт. вольных зямель, не занятых сялянамі і якія ня могуць быць апрацаваны ў парадку індывідуальнае працы, сіламі сялянскага інвэнтару.

Значэньне колгаснага руху ва ўсіх яго фазах,—і першапачатковай яго фазе, і больш разьвітой фазе,—калі ён узброены трактарамі, заключаецца ў тым, што сяляне цяпер атрымліваюць магчымасьць пусьціць у ход пакінутыя землі і цаліну.

У гэтым сакрэт вялізарнага пашырэньня пасеўнае плошчы пры пераходзе сялян на колектыўную працу. У гэтым адна з асноў перавагі колгасаў перад індывідуальнай сялянскай гаспадаркай.

Няма чаго і гаварыць, што перавага колгасаў перад індывідуальнай сялянскай гаспадаркай стане яшчэ больш бясспрэчнаю, калі на дапамогу першапачатковым колгасам у раёнах суцэльнае колектывізацыі падыйдуць нашы машынна трактарныя станцыі, калёны, калі самі колгасы атрымаюць магчымасьць згуртаваць у сваіх руках трактары і комбайны.

ГОРАД І ВЁСКА

Існуюць забабоны, якія культывуюцца буржуазнымі эконамістымі, адносна так званых „нажнічак“, якім неабходна абвясьціць бязьлітасную вайну, як і ўсім іншым буржуазным тэорыям, якія, на жаль, пашыраюцца ў савецкім друку. Я маю на ўвазе тэорыю аб тым, што Кастрычнікавая рэвалюцыя, быццам, дала сялянству менш, чым лютаўская рэвалюцыя, што Кастрычнікавая рэвалюцыя, уласна кажучы, нічога не дала сялянству. Гэтыя забабоны, адзін час мусаваліся ў нашым друку адным з „савецкіх“ эканамістых. Праўда ён, гэты „савецкі“ эканаміст, з часам адмовіўся ад свае тэорыі (голас: „Хто-ж гэта?“). Гэта Громан. Але гэтая тэорыя была падхоплена трацкісцка-зіноўеўскай опозыцыяй і выкарыстана супроць партыі. Прычым няма ніякіх падстаў сьцьвярджаць, што яна ня мае хаджэньня ў сучасны момант у колах „савецкае грамадзкасьці“. Гэта вельмі важнае пытаньне, таварышы.

Ён закранае праблему ўзаемаадносін паміж горадам і вёскаю. Ен закранае проблему зьнішчэньня супроцьлегласьці паміж горадам і вёскай. Таму, я лічу, што варта заняцца гэтай дзіўнай тэорыяй.

Ці верна, што сяляе нічога не атрымалі ад Кастрычнікавай рэвалюцыі? Зьвернемся да фактаў. У мяне на р у к а х в я д о м а я табліца в я д о м а г а статыстыка Нямчынава, апублікаваная ў маім артыкуле „На хлебным фронце“. З гэтай табліцы відаць, што ў дарэвалюцыйны час памешчыкі „выраблялі“ ня менш 600 млн. пудоў збожжа. Значыцца, памешчыкі зьяўляліся тады трымальнікамі 600 міліёнаў пудоў хлеба. Гэта вельмі вялікая сіла, якой уладалі тады памешчыкі. Бедната-ж і серадиякі выраблялі 2500 млн. пудоў хлеба. Такі малюнак становішча ў старой вёсцы—вёсцы да Кастрычнікавай рэвалюцыі. Якія зьмены адбыліся ў вёсцы пасьля Кастрычніка? Бяру лічбы з тае-ж табліцы. Узяць, напрыклад, 1927 г. Колькі выраблялі ў гэтым годзе памешчыкі? Ясна што яны нічога не выраблялі і не маглі вырабляць, бо памешчыкі былі зьнішчаны Кастрычнікавай рэвалюцыяй. Вы разумееце, што гэта павінна было паслужыць вялікім палягчэньнем для сялянства бо сяляне вызваліліся з-пад памешчыцкага ўціску. Гэта, зразумела, вялікі выйгрыш для сялянства, атрыманы ім у выніку Кастрычнікавай рэвалюцыі. Колькі выраблялі кулакі ў 1927 г.? 600 млн. пудоў хлеба замест 1900 млн. Дык кулакі паслабелі ў пэрыяд пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі больш чым у тры разы. Вы разумееце, што гэта не магло не палегчыць становішча беднаты і серадняkоў. А колькі выраблі ў 1927 г. беднага і серадиякі? 4 міліярды пудоў замест 2500 млн. пуд. Дык беднага і серадиякі пачалі вырабляць пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі на 1,5 міліярдаў пудоў хлеба больш, чым у дарэвалюцыйны час. Вось вам факты, якія гавораць аб тым, што бедиякі і серадиякі атрымалі вялізны выйгрыш ад Кастрычнікавай рэволюцыі. Вось што дала Кастрычнікавая рэволюцыя беднякам і серадняком. Як можна пасьля гэтага сьцьвярджаць, што Кастрычнікавая рэволюцыя нічога не дала сялянам? Але гэта ня ўсё, таварышы.

Канец будзе

УКЛЮЧЫМ ПРАВАДЫ КОМСАМОЛЬСКАЙ ЭНЭРГІІ І ЭНТУЗІАЗМУ Ў БАРАЦЬБУ З КЛЯСАВА-ВАРОЖАЙ, НАЦЫЯНАЛ-ДЭМОКРАТЫЧНАЙ, ШОВІНІСТЫЧНАЙ ІДЭОЛЁГІЯЙ УСІХ КОЛЕРАЎ



На здымку зьлева направа: 1) Куток з старадаўнімі кнігамі бібліотэкі Беларускай Акадэміі Навук; 2) Комсамолка-асыстэнтка за працай у хэмгабінэце Акадэміі: 3) У юнацкім сэктары базы Белдзяржвыдавецтва; 4) У біолёгічным габінэце; 5) Студэнты за вучобай у новай лекцыйнай залі мэдфаку ва унівэрсытэцкім гарадку; 6) На базе Белдзяржвыдавецтва.

ЛЕНІНСКІ КОМСАМОЛ НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРОЛЕТАРСКУЮ КУЛЬТУРУ

Ленінскі комсамол Беларусі пачынаючы з 1930 году будзе займацца працаю, якая бязумоўна мае вялізарнае палітычнае значэньне ў пэрыод соцыялістычнай рэконструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі і культурнае рэволюцыі—трохмесячнікам беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры.

За ўвесь час існаваньня Савецкай Беларусі бурна расьце матар'яльная база працоўнага насельніцтва і нябачана ўздымаецца яго культурны ўзровень.

Заканчваецца пабудова Асінбуду, шпаркім тэмпам растуць новыя буйныя фабрыкі і заводы, камбінаты, колгасы, навукова дасьледчай установы, ВУЗ'ы, тэхнікумы, профшколы.

Савецкая Беларусь пакрываецца густою сеткай школ усеагульнага навучаньня, ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дарослага працоўнага насельніцтва.

Тэатры музэі, кіно абслугоўваюць як рабочых гарадоў, так і працоўнае насельніцтва мястэчак і вёсак.

Партыйны, комсамольскі, профэсыйны і савецкі друк абслугоўваюць працоўных БССР друкаваным словам у мільёнах экзэмпляраў часопісаў, газэт і рознага прызначэньня кніжак і брашурак.

Гэты пералік мерапрыемстваў па ўзьняцьцю матар'яльнага добрабыту і культурнага ўзроўню працоўных БССР сьведчыць, што мы дасяглі вялікіх, нябачаных працоўнымі Беларусі—на працягу ўсяе яе гісторыі, вынікаў.

Але паўстае пытаньне ці ўсё робіцца добра на нашым культурным вучастку соцыялістычнага будаўніцтва. Ці ня ўзрастаюць сярод здаровага насеньня пролетарскай культуры і „плевелы" буржуазнай нацыяналістычнай культуры, якія засьмечваюць і імкнуцца заглушыць нашыя пролетарскія ўсходы

Хто актыўна штодня прымае ўдзел у рэволюцыйнай барацьбе пролетарыяту супроць яго клясавых ворагаў на ўсіх франтох клясавага змаганьня, і ў прыватнасьці на культурным вучастку, добрасумленна скажа—так, культурнае соцыялістычнае будаўніцтва пад-час ідзе ў нас ня зусім добра. Сярод густых усходаў пролетарскай культуры ёсьць у нас ня мала, у некаторых мясцох, і буржуазныя, шкодныя для нас „плевелы".

Наш ленінскі комсамол на працягу свайго трохмесячніку беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры, задумаўшы яго, трэба проста сказаць, вельмі своечасова павінен заглянуць сваім маладым, гострым комсамольскім вокам ва ўсе вучасткі нашага культурнага соцыялістычнага будаўніцтва і заўважыўшы ўсё антыпролерскае, з карэньнем вырваць буржуазнае сьмецьце і гэтым дапамагчы больш хуткаму росту пролетарскай культуры.

На працягу трохмесячніку комсамольцы і асабліва тыя, што знаходзяцца на вучобе павінны будуць уважліва прыслухацца да ўсяго, што гавораць нашай вучнёўскай моладзі на лекцыях, як профэсары з вузаўскіх катэдраў, гэтак і настаўнікі ва ўсіх тыпах навучальных ўстаноў. Ці няма часам у іх лекцыях і іншых занятках шкоднага для пролетарскай культуры. Заглянуць у навуковыя творы, падручнікі і дзіцячую літаратуру, павесьці рашучую барацьбу супроць усяго, што знойдзена будзе там буржуазнае, не пролетарскае.

За гэты час трэба комсамолу добра азнаёміцца са зьместам п'ес нашых нацыянальных тэатраў, кіно-фільмаў і заглянуць у рабочыя клюбы, Нардамы, хаты-чытальні і ўсякім спосабам і сродкамі дапамагчы росту там пролетарскай культуры.

Патрэбна будзе перачытаць на фабрыках, заводах, культасьветных і іншых савецкіх устаноў і організацыях насьценныя газэты. дзе патрэбна будзе дапамагчы ім стаць на правільны пролетарскі шлях. Трэба гэта зрабіць.

У час трохмесячніку раю пабываць на кніжных базах БДВ, у кнігарнях, магазынах і кіосках, на вакзалах і на вуліцах гарадоў і пацікавіцца, як прасоўваецца кніжка ў працоўныя масы і дапамагчы, калі яны залежваюцца на базах і іх грызуць там замест людзей мышы, выратаваць ад шкодніцтваў усіх відаў і накіраваць хутчэй па прызначэньню.

Трэба праверыць бібліотэчныя каталёгі і музэйныя экспонаты і ўсё, што будзе знойдзена шкоднае для пролетарскай культуры, выявіць за гэты час па магчымасьці і прыняць адпаведныя крокі для зьнішчэньня.

Паслухайце добра сваім тонкім комсамольскім вухам, аб чым апавядаюць у нашых капэлях, хорах, харавых гуртках, у школах і у дзіцячых садох і што граюць на вокальна-музыкальных нашых вечарох і на колькі яно там пролетарскае па свайму зьместу.

Маю упэўненасьць, што ні адно ні вуснае, ні друкаванае слова, а ні адна культурная ўстанова не прапушчана будзе нашым шустрым комсамолам у час трохмесячніку, і зроблена дапамога, якая патрэбна будзе з боку комсамолу для ачысткі пролетарскай культуры ад усяго ў ёй непролетарскага,

Там дзе беларуская і нацменаўская пролетарская культура ў сваім росьце сустракаюць розныя перашкоды комсамол дапаможа нашай комуністычнай партыі выявіць і зьнішчыць гэтыя перашкоды.

Жадаю нашаму слаўнаму Ленінскаму Комсамолу посьпехаў у вялікай яго працы па правядзеньню трохмесячніку.

Так, комсамольскія рады на лінію агню. У бой за пролетарскую культуру, супроць усяго буржуазнага ў ей.

РЭКТАР БДУ Я. КАРАНЕЎСКІ.

УЗЯЦЬ ПЕРАКОП

1-е студзеня 1930 году зьяўляецца датай новага вялікага ўкладу Ленінскага Комсамолу Беларусі ў соцыялістычнае будаўніцтва. Комсамол Беларусі, а разам з ім і ўся грамадзкасьць выступае разгорнутым фронтам за падцягненьне тэмпаў культурнага да тэмпаў гаспадарчага будаўніцтва, за будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме і пролетарскай па зьместу, за поўнае аўладаньне пролетарыятам камандными вышынямі ўсіх разнастайных галін нацыянальнага культурнага будаўніцтва.

Барацьба за пролетарскую культуру немагчыма без перамогі коснасьці і старых традыцый, без выкарчоўваньня старых звычаяў. Рабочая і сялянская моладзь меней ўсіх зьвязана з старым, карэньні старога яшчэ ня глыбокі ў псыхолёгіі, звычаях працоўнай моладзі. Аднак, трэба памятаць, што у сучасных умовах абвостранай клясавай барацьбы, штодзённыя абставіны жыцьця, барацьбы і будаўніцтва кладуць свой адбітак на псыхолёгію і характар моладзі. Адны абставіны выхоўваюць сьмелы рэволюцыйны характар, другія наадварот, выхоўваюць павольнасьць, пасыўнасьць і г. д. і таму будні культурнага будаўніцтва—будаўніцтва пролетарскай культуры для моладзі адыгрвае асабліва важную ролю. Нам патрэбна выхоўваць людзкі матар'ял, які ў любую хвіліну, на любым вучастку соцыялістычнага будаўніцтва будзе гатоў змагацца пад сьцягам комуністычнае рэволюцыі, вось чаму зараз надышоў час праверыць наколькі ўсе ачагі культурнага будаўніцтва, усе зброі соцыяльнага ўзьдзейнічаньня на масы, літаратура, мастацтва і іншае, адпавядаюць пэрыоду соцыялістычнае рэконструкцыі народнае гаспадаркі, запальваюць сотні тысяч працоўных гэроізмам, пафасам соцыялістычнага будаўніцтва, ламаюць і зьнішчаюць старыя звычаі, забабоны і г. д.

Сёньня мы з асаблівым задавальненьнем адзначаем, што кінуты заклік 2 тыдні таму назад Комуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі, аб 3-х месячніку Беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры да ўсіх комсамольцаў, да ўсёй працоўнай моладзі і пролетарскай грамадзкасьці, пачаў уздымаць новую хвалю творчага энтузіазму комсамолу і працоўных. Вось кароткі малюнак першых пачынаньняў па 3-х месячніку. Ячэйка курсаў Комсамольскага актыву ўзяла на сябе абавязак дапамагчы Койданаўскаму раёну Менскай акругі ў правядзеньні 3-х месячніку і 31-га сьнежня выехала першая брыгада ў колькасьці 20 чалавек, для організацыі практычнай работы.

Койданаўскія комсамольцы намецілі шэраг надзвычайна цікавых мерапрыемстваў і пачынаюць праводзіць у жыцьцё. Такія-ж паведамленьні мы маем з другога Віцебскага раёну і іншых месц. Да 3-х месячніку пачала далучацца пролетарская грамадзкасьць як та: БелАПП, ЦК Працасьветы, МБТ і інш. Нарэшце, два дні таму назад рэдакцыя „Чырвоная Зьмена" атрымала ліст ад настаўніка Бакштэйна Бардзілаўскай школы Самахвалавіцкага раёну Менскай акругі, аб тым, што ён ня хоча быць у баку ад гэтай вялізарнейшай работы (ліст друкуецца).

Няхай гэтыя паасобныя пытаньні вырастуць у магутны рух па аўладаньню і будаўніцтву беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры, які (рух) ахопіць самыя далёкія вёскі Палесься.

Перад ўсёй пролетарскай грамадзкасьцю Беларусі мы вітаем Вас комсамольцы Курсаў Комсамольскага Актыву, мы вітаем Вас комсамольцы Койданаўскага і Віцебскага раёну, мы вітаем усіх тых, хто першым уключаецца ў бурны паток соцыялістычнага будаўніцтва. у бурны паток соцыялістычнай рэволюцыі.

Таварышы! Рабочыя і работніцы, батракі і батрачкі, бядняцка-серадняцкія колы сялянства, пісьменьнікі, музыканты, композытары, настаўнікі, навуковыя працаўнікі, інжынэры, тэхнікі, студэнты, піонэры, у дзень пачатку 3-х месячніку беларускай пролетарскай і нацменаўскай культуры, Ленінскі Комсамол яшчэ раз зьвяртаецца да Вас і заклікае, каб кожны па сваіх магчымасьцях і здольнасьцях улажыў свой уклад у соцыялістычнае будаўніцтва, у вырашэньне задач культурнай рэволюцыі.

Таварышы комсамольцы і працоўная моладзь. Перад намі вялічэзная задача ўзяць перакопы векавой культурнай заняпаласьці, магчымасьці ў нас ёсьць, дык давайце з вялізарным энтузіазмам комсамолу пад кіраўніцтва Комуністычнай Партыі—возьмем.

Е. Шоламаў.

АД БАЯВЫХ ЛЁЗУНГАЎ--ДА ЖЫВЫХ СПРАЎ

Па пытаньню правядзеньня трохмесячніка беларускай пролетарскай культуры і пролетарскай культуры нацменшасьцяў Койданаўская комсамольская організацыя прыняла цэлы шэраг мерапрыемстаў, намеціўшы плян конкрэтнай работы па ячэйках. Больш важныя з пунктаў гэтай пастановы мы прыводзім ніжэй:

У мястэчку Койданове правесьці сход трох ячэек, з пытаньнем нацполітыкі партыі і сутнасьць нацыцыянал-дэмократызму.

Закончыць працу пачатую ў час бібліотэчнага паходу па праверцы працы бібліотэкі і пасьля гэтага правесьці двухдзённы збор кніжак беларускіх, польскіх і яўрэйскіх. Аформіць пры ячэйках групы кніганош, правесьці раённую нараду кніганошаў. Організаваць перадвіжную раёную комсамольскую бібліотэчку на паявыя сродкі.

Організаваць 3 сустрэчы пролетарскіх пісьменьнікаў, загадзя правёўшы шырокае абгаварэньне асобных літаратурных твораў.

З мэтай поўнага падпарадкаваньня вясковай вячоркі задачам соцыялістычнага будаўніцтва краіны, правесьці нараду музыкантаў, запявал, драмгурткоў, дэкляматараў, правёўшы конкурс на лепшага запявалу, гарманістага, драмгурток і інш.

Праверыць, як выконваецца плян усеагульнага навучаньня ў раёне. Як уцягнуты ў школы дзеці беднаты, батрацтва. Правесьці раённы зьлёт польскай рабочай батрацкай, бядняцкай моладзі, па пытаньню разьвіцьця польскай пролетарскай культуры ў СССР, БССР і задачы разьвіцьця яе ў раёне.

Уся праца па правядзеньню трохмесячніку павінна быць шчыльна ўвязана з задачай колектывізацыі раёну да вясны 30 году на 60 пр. Правесьці раённы зьлёт комсамольскай організацыі разам з беспартыйнай батрацка-бядняцкай і серадняцкай моладзьдзю па пытаньню колектывізацыі і нацкультбудаўніцтва раёну.

ВЫКЛІКАЮ НА СОЦСПАБОРНІЦТВА

Я настаўнік Бардзілаўскай школы, Самахвалавіцкага раёну, юнкор, „Чырвонай Зьмены"—Бакштэйн жадаючы непасрэдна ўдзельнічаць у практычным выкананьні задач трохмесячніку беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры, бяру на сябе абавязак практычна прарабіць наступнае:

1. Два разы ў месяц рабіць абход трох вёсак, якія абслугоўваюцца школай з мэтай распаўсюджваньня беларускай пролетарскай літаратуры.
2. Кожныя два тыдні буду праводзіць чыткі лепшых мастацкіх твораў беларускай пролетарскай літаратуры.
3. Організаваць пры школе літаратурны гурток.
4. Організаваць гурток юнкораў.
5. Правесьці праверку ці ўсе няпісьменныя займаюцца ў лікпункце, прыняць шэраг захадаў растлумачальнага характару, да поўнага ўцягненьня няпісьменных, асабліва моладзі, у лікпункт.
6. На працягу трохмесячніку дабіцца выпіскі розных газэт ня менш 1 экзэмпляру на двор.
7. Організаваць пры школе драматычны гурток з моладзі і вучняў.

Усе гэтыя мерапрыемствы абавязваюся выканаць і замацаваць на працягу трохмесячніку і выклікаю ўсіх настаўнікаў Самахвалавіцкага раёну, стаць пасьлядоўцамі майго прыкладу. БАКШТЭЙН.

Супроць „мастацтва для мастацтва"

Мы мастакі ў нагу з перадавымі культурнікамі павінны дапамагчы комсамолу ў 3-хмесячніку культпаходу і сёньня-ж прыняць культшэфства над клюбам ці чытальняй свайго раёну.

Я прыняў шэфства над хатай-чытальняй Татарскай слабодкі і выклікаю зрабіць гэтак сама і пачаць са мной спаборніцтва наступных мастакоў: А. Абрамава, Гальмаджэана, П. Гуткоўскага, Г. Змудзінскага, Я. Кешкеля і Тарасава.

ВАЛО.

РАЗГОРНУТЫМ ФРОНТАМ У ПАХОД

ЗА ПАДЦЯГНЕНЬНЕ КУЛЬТУРНАГА ТЭМПА ДА ТЭМПАЎ ГАСПАДАРЧАГА БУДАЎНІЦТВА

ЗА ПРАЦУ, БО ЧАС НЕ ЧАКАЕ!

Социялістычнае спаборніцтва, якое пачалося па ініцыятыве комсамолу, разгарнулася ў магутную хвалю творчага ўздыму мільёных мас рабочых і працоўных. Соцыялістычнае спаборніцтва зараз у асноўным зрабілася галоўным мэтадам працы па новаму, па рэвалюцыйнаму. У паток спаборнічаючых уцягваюцца ўсё новыя і новыя сілы рабочых, працоўных.

Зараз комсамол Беларусі робіць яшчэ адно з вялікіх пачынаньняў—праводзіць трохмесячнік пролетарскай беларускай і нацменаўскай культуры. Ня можна прайсьці міма, ня можна не ацаніць вагромністага палітычнага значэньня, ня вітаць гэтага вялікага пачынаньня.

Кастрычнікавая рэвалюцыя пад кіраўніцтвам Кампартыі дала магчымасьць рабочай клясе, працоўным масам Беларусі будаваць новую, Савецкую Беларусь, магутна ўздымаць экономіку, культуру краіны. Нашы посьпехі ў соцыялістычным будаўніцтве краіны вядомы кожнаму.

Узрост прамысловасьці, нябываны тэмп колектывізацыі, узмацненьне дыктатуры пролетарыяту, узрост колькасьці рабочае клясы, узмацненьне саюзу рабочае клясы з беднатой, серадняцтвам вёскі на новых асновах з адначасовым пасіленьнем кіруючай ролі пролетарыяту ў гэтым саюзе, братэрская сувязь працоўных усіх нацыянальнасьцяў БССР, посьпехі ў культурным будаўніцтве—усё гэта вынік правільнага ленінскага кіраўніцтва нашай партыі.

Мы не застанаўліваемся на мейсцы. Мы ідзем наперад. Мы паскараем тэмп нашага пасоўваньня наперад. Мы рвем карэньні капіталізму, рашуча наступаем на клясавага ворага—нэпмана, кулака. Мы маем усе магчымасьці вырашыць задачу „дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны". І мы ўжо вырашаем гэтую задачу. Зараз рабочымі масамі ўжо высунута задача: „ажыцьцявіць пяцігодку у чатыры гады".

Наша гаспадарчае будаўніцтва апярэдзіла культурнае будаўніцтва Праблемы культурнага будаўніцтва ў нас стаяць асабліва востра. Зараз на гэты фронт нам трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу, каб падцягнуць культурнае будаўніцтва, каб яно не адставала ад гаспадарчага будаўніцтва.

Культурнае буданіцтва, як і гаспадарчае ў нас праходзіць ва ўмовах разгорнутай клясавай барацьбы За апошні час мы маем актывізацыю варожых нам сіл на культурна-нацыянальным фронце (узрост беларускага нацыянал-дэмакратызму, як найбольш небясьпечнага на даным этапе, шавінізму ўсіх масьцей і колераў, антысэмітызму і г. д.). Клясавы вораг ня сьпіць, ён спрабуе перашкаджаць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву.

Трохмесячнік—гэта практычнае ажыцьцяўленьне пастаўленых партыяй перад краінай задач культурнага будаўніцтва, задачы падагнаць тэмпы культурнага будаўніцтва, да тэмпаў гаспадарчага будаўніцтва, задача змагацца за генэральную лінію партыі ў культурным будаўніцтве.

Вызначаныя цэнтральным штабам па правядзеньню 3-хмесячніку практычныя мерапрыемствы зьяўляюцца тым напрамкам, па якому павінен ісьці трохмесячнік. На дапамогу комсамолу павінна прайсьці і ўся пролетарска-савецкая грамадзкасьць. На дапамогу комсамолу павінна прайсьці і пройдзе ўся маса асьветнікаў Беларусі. Агульнымі сіламі, пад кіраўніцтвам партыі, даб'ёмся добрых вынікаў трохмесячніку беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры.

Цэнтральнае праўленьне саюзу працасьветы заклікае ўсю асьветніцкую масу Беларусі да актыўнага ўдзелу і дапамозе комсамолу ў правядзеньні трохмесячніку.

ЦП упэўнена ў тым, што перадавая лепшая частка асьветнікаў дасьць прыклад таго, як трэба праводзіць у жыцьцё задачы культурнага будаўніцтва, пастаўленыя партыяй перад краінай і што асноўная маса асьветнікаў у трохмесячніку будзе найлепшым памоцнікам комсамолу.

За працу, бо час не чакае.

РЫЧКОЎ.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ТРОХМЕСЯЧНІКУ

29-30 сьнежня адбыўся пленум МенАК ЛКСМБ. дзе побач з іншымі пытаньнямі зацьверджан плян правядзеньня трохмесячніку беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры на акрузе.

* З 1 па 15 лютага будзе праведзен двухтыднёвік праверкі выкананьня соцыялістычнага дагавору паміж Менскам і Кіевам па пытаньню ўдзелу КСМ у нацыянальна-пролетарскім культурным будаўніцтве.

* АК і РК ЛКСМБ сумесна з ЦП саюзу сельгас і лясных рабочых. будзе організована масавая праверка працы таварыства „Прэч Няпісьменнасьць". па зьнішчэньню няпісьменнасьці сярод батракоў.

* У часе правядзеньня трохмесячніку, будзе організован акруговы зьлёт гарманістаў, цымбалістаў, дудароў.

* Па буйнейшых гарадзкіх ячэйках будуць організаваны ўрачыстыя вечары прысьвечаныя трохмесячніку, на якія будзе запрошана працоўная сялянская моладзь падшэфных вёсак.

* Пры Цэнтральным Доме Комсамолу будуць наладжаны цэлы шэраг лекцый на тэмы: „Што такое нацыянал - дэмакратызм", „Роля компартыі Заходняй Беларусі ў рэволюцыйным нацыянал - вызваленчым руху" і інш.

* Па гор. Менску і Барысаву будуць мобілізаваны 100 і па вёсцы 360 комсамольцаў для работы ў школах малапісьменных і лікпунктах.

* Для працы ў якасьці загадчыкаў хат-чытален, нардамоў будуць мобілізаваны 15 лепшых комсамольцаў-комуністых.

* Сіламі комсамолу па акрузе будуць організаваны 130 новых бібліотэк.

* У раёнах суцэльнай колектывізацыі будуць наладжаны сутаварыскія стрэчы пісьменьнікаў з колгаснай і совгаснай моладзьдзю.

ЛІТОЎСКІЯ ПРАЦОЎНЫЯ МАСЫ ПОЙДУЦЬ НАСУСТРАЧ КУЛЬТУРНАМУ ПАХОДУ КОМСАМОЛУ

Літоўскае насельніцтва ў Савецкай Беларусі. як у горадзе, так і ў вёсцы, зьяўляецца культурна вельмі адсталай часткай насельніцтва. Літоўскія вёскі, у сваёй большасьці, знаходзяцца далёка ад культурных цэнтраў і раней ня мелі школ па сваёй роднай мове, ня было адпаведных кніжак. ня было і газэты.

Каталіцкае духавенства і кулацтва карыстаючыся лёзунгам „Нацыянальнага адзінства", мелі вялікі ўплыў на культурна і палітычна адсталае літоўскае насельніцтва.

Зараз у розных раёнах ужо працуюць адзінаццаць літоўскіх пачатковых школ. адна школа пераросоўка і школа сялянскай моладзі. Ёсьць адзін нацыянальны сельсавет, літоўская хата-чытальня (у Расьнянскім раёне) і ў розных літоўскіх вёсках маюцца 17 чырвоных куткоў. У Менску выдаецца літоўская газэта і Белдзяржвыдавецтвам вядзецца праца па выданьню неабходных кніжак на літоўскай мове.

Літоўскае працоўнае насельніцтва Савецкай Беларусі ў падняцьці свайго культурнага ўзроўню зараз дасягнула значных посьпехаў. Узьнялася і політычная сьвядомасьць літоўскай беднаты і серадняцтва.

Клясавая барацьба ў літоўскай вёсцы прыняла вельмі востры характар Кулацтва разам з ксяндзамі вядзе шалёны напад на вясковы актыў, супроць соцыялістычнага будаўніцтва. Варожыя элемэнты літоўскай вёскі сталі праяўляць вялікую актыўнасьць.

Нам трэба канчаткова зламаць супраціўленьне кулака і пазбавіць уплыву клерыкальных элементаў. А дзеля гэтага неабходна ўзмацніць культурную палітасьветную працу сярод літоўскага працоўнага насельніцтва.

Трохмесячнік беларускай і нацменаўская пралетарскай культуры які праводзіцца комсамолам у гэтай справе павінен аказаць вялікую дапамогу. Кожны комсамолец павінен памятаць, што на культурную працу, сярод нацменшасьцяў, неабходна зьвярнуць найбольшую ўвагу.

Трэба памятаць, маючыяся асаблівасьці жыцьця нацменшасьцяў: нацыянальную замкнутасьць, культурную і політычную адсталасьць і наліччa пераважнага проценту капіталістычных элемэнтаў, чымся ў беларускай вёскі.

Літоўскае працоўнае насельніцтва з радасьцю пойдзе насустрач культурнаму паходу комсамолу.

Трохмесячнік дапаможа літоўскай вёсцы скінуць нацыянальную замкнутасьць, пашырыць працу інтэрнацыянальнага выхаваньня і рэконструіраваць сельскую гаспадарку. зьліваючыся ў буйныя колгасы

Задача кожнага працоўнага дапамагчы комсамолу ў правядзеньні трохмесячніка.

І БУЧУКАС.

Тэлеграмы

„Год майскіх барыкад"

БЭРЛІН, 1-I. Орган нямецкай кампартыі «Ротэ Фанэ» прысьвечвае спэцыяльны артыкул разьвіцьцю унутры-політычного становішча ў Нямеччыне. Артыкул мае загаловак „Год майскіх барыкад".

Газэта заяўляе, што «год майскіх барыкад» не заканчэньне, а пачатак рэвалюцыйнага разьвіцьця сучаснага становішча. Гэта паставіць пытаньне аб уладзе ў Нямеччыне ў парадак штодзённых задач. Год майскіх барыкад адзначыўся ростам кадраў рэвалюцыйных класавых барацьбітоў, выявіліў магутныя сілы, якія ў момант, вызначаны не Цэргібэлем, а кампартыяй, зробяць сьмяротны ўдар сучаснай сыстэме".

У артыкуле, прысьвечаным новаму году пад загалоўкам «Год рашучых перамог» газэта спыняецца на разьвіцьці бальшавіцкага наступу ў Савецкім Саюзе на усіх франтох. Газэта падкрэсьлівае сацыялістычнае будаўніцтва ў прамысловасьці, сельскай гаспадарцы, пасьпешнае вырашэньне канфлікту на УК чыгунцы і барацьбы з апартунізмам УсеКП(б) якая скончылася поўным разгромам апартуністаў.

Зачыніць усе цэрквы, зьняць званы

КРАСНАЯРСК, 1-I. Двухтысячны сход рабочых чыгуначных майстарняў патрабуе неадкладнага скліку па-за чарговага пленуму гарсавету для вырашэньня пытаньня аб зачыненьні у горадзе ўсіх цэркваў і зьняцьця званоў.

Сход абвясьціў 7-га студзеня—дзень старых калляд—трэцім днём індустрыялізацыі.

Іскры радыё

* 27-га сьнежня баявая тройка пры ЦК УсеЛКСМ заслухала даклады прадстаўнікоў Цэнтрасаюзу, Дзяржгандлю і МК комсамолу аб ходзе ўсесаюзнага збору прадметаў другазначнага экспорту. Пасылаўся шэраг ударных брыгад у розныя вобласьці СССР. У Маскоўскай вобласьці 10-га студзеня пачынаецца месячнік ударнай работы комсамолу па збору.

Баявая тройка вырашыла прасіць ЦК УсеЛКСМ абвясьціць 15-га студзеня Усесаюзным днём ударнай работы па збору прадметаў другазначнага экспорту.

* Колгасцэнтр СССР пастанавіў адпусьціць 50 мільёнаў рублёў на падрыхтоўку кадраў для колгаснага будаўніцтва.

5000—замест 1500

МАСКВА, 31. Вясковы аддзел ЦБ УсеЛКСМ атрымаў паведамленьне, што ў Ленінградзкай вобласьці на лесазагатоўкі мобілізавана 5000 комсамольцаў, замест вызначаных 1500

Стачачны рух у Паўднёвай Нігэрыі шырыцца

ЛЁНДАН. 31. Апошнія афіцыйныя весткі падцьвярджаюць, што стачачны рух у ангельскай калёніі Паўднёвая Нігэрыя працягваецца. Гэты рух мацней за ўсё расьце ў паўднёвых раёнах.

Комсамольскі календар

4-I роўна а 5 гадзіне, у памяшканьні Фрунзэўскага РК ЛКСМБ (вуліца Энгельса) адбудзецца пасяджэньне РБЮП Яўка ўсіх сяброў РБЮП абавязкова.

Менакрбюро прапануе ўсім атрадам да 7 студзеня выдзеліць па аднаму прадстаўніку ў савет Цэнтр. піанэр. клюбу.

Выдзеленныя прадстаўнікі павінны зьявіцца 8 студзеня, а 7-ай гадзіне ўвечары ў піанэр-клюб.

Прыцягнуць шырокія колы працоўных да будаўніцтва беларускай і нацменаўскай пролетарскай літаратуры

ПАСТАНОВА СЭКРАТАРЫЯТУ БелАПП'у аб удзеле ў 3-месячніку беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры

1. Будаўніцтва беларускай пролетарскай культуры і ў прыватнасьці беларускай пролетарскай літаратуры, а таксама пролетарскай літаратуры нацменшасьцяў БССР праходзіць ва ўмовах шырыко-разгорнутай рэконструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі БССР і індустрыялізацыі краіны, шпаркі тэмп колектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Рабочая кляса і працоўнае сялянства БССР, разам з пролетарыятам і працоўнымі ўсяго Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі будуюць новае социялістычнае жыцьцё: новую гаспадарку, новы быт, новую пролетарскую культуру.

Адзінаццаць год існаваньня савецкай Беларусі, вялізарны рост прамысловасьці і соцыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі ў БССР і вялізарны, нябачаны ніколі раней рост культурна-нацыянальнага будаўніцтва, рост беларускай культуры і культуры нацменшасьцяў,—сталі магчымы толькі дзякуючы пролетарскай рэволюцыі, якая вызваліла раней прыгнечаныя народы і зрабіла іх роўнымі ў вялікай сям'і працоўных Савецкага Саюзу, толькі дзякуючы ленінскаму кіраўніцтву комуністычнай партыі.

Будуючы соцыялізм пролетарыят і працоўныя вядуць рашучы наступ на капіталістычны элемэнт у краіне, сьмела і рашуча выкарчоўваюць карэньні капіталізму, у краіне ва ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва праходзіць абвостраная клясавая барацьба, якая асабліва за апошні год мела свой яскравы адбітак і ў культурна-нацыянальным будаўніцтва і на фронце літаратуры. Літаратура, як адна з галін ідэолёгіі, зьяўляецца важнейшым вучасткам у культурна-нацыянальным будаўніцтве і складанейшым вучасткам клясавай барацьбы. У апошнія часы, побач з значным ростам беларускай пролетарскай культуры і пролетарскай літаратуры нацменшасьцяў мы ў БССР мелі ў літаратуры шэраг нацыянал-дэмократычных і шовіністычных выступленьняў і выступленьняў яўна антысавецкіх, контр-рэволюцыйных.

БелАПП пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі вядзе ўпартую барацьбу за пролетарскую літаратуру і заўсёды, як і раней будзе даваць самы няшчадны адпор вылазкам клясавага ворага ў літаратуры, ці то яны будуць насіць яўна антысавецкі контррэволюцыйны характар, ці будуць замаскаваны ў форме беларускага нацыянал дэмократызму, ці нацыяналізмаў другіх масьцей.

Будаўніцтва беларускай пролетарскай літаратуры, пролетарскай літаратуры нацменшасьцяў БССР, як і ўсё культурна-нацыянальнае будаўніцтва, немагчымы без удзелу самых шырокіх мас працоўных і працоўнай моладзі, ва ўмовах абвостранай барацьбы за пролетарскую літаратуру. БелАПП'у, як ніколі патрэбен удзел працоўных мас і комсамолу. Таму сэкратарыят БелАПП'у горача вітае ініцыятыву ЛКСМБ у правядзеньні трохмесячніку беларускай пролетарскай культуры і пролетарскай культуры нацменшасьцяў. і далучаючыся да ініцыятывы комсамолу, абавязвае усіх сяброў Беласпролетарскіх пісьменьнікаў і акруговай філіі БелАПП'у прыняць самы актыўны удзел у правядзеньні трохмесячніку—шляхам азнаямленьня працоўных мас і працоўнай моладзі з развіцьцём і дасягненьнямі беларускай пролетарскай літаратуры і пролетарскай літаратуры нацменшасьцяў БССР.

З мэтай большага удзелу пролетарскага пісьменьніцтва ў трохмесячніку, сэкратарыят БелАПП'у пастанаўляе, стварыць у складзе Менскай філіі БелАПП'у ударную літаратурную брыгаду паставіўшы перад ёю задачу абслужыць літаратурнымі выступленьнямі (даклады, дыспуты. чытаньне твораў) тыя фабрыкі і заводы, якія актыўней удзельнічаюць у соцыялістычным будаўніцтве і якія найлепш будуць удзельнічаць у трохмесячніку.

Акрамя гэтага удзел Беласоцыяцыі пролетарскіх пісьменьнікаў у трохмесячніку павінен ісьці у парадку:

Дапамогі комсамольскім ячэйкам у організацыі літаратурных гурткоў з рабочай і працоўнай сялянскай моладзі.

Дапамогі ячэйкам у організацыі мас чытачоў у пролетарскай беларускай літаратуры і пролетарскай літаратуры нацменшасьцяў для шырокага колектыўнага абгаварэньня асобных твораў і творчасьці асобных беларускіх пісьменьнікаў.

Для садзейнічаньня цэнтральнаму штабу па правядзеньню трохмесячніку, сэкратарыят вылучае тройку у складзе таварышоў: Звонака, Вітэнзона і Салагуба.

Сэкратарыят БелАПП'у.

Адказны рэдактар
А. Джолюк

Менск, друкарня БДВ. Галоўлітбел 599